# ПРЫСЛОЎЕ

Першы ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце прыслоўі:
1) які-небудзь;
2) дадому;
3) сам;
4) наперакор;
5) тады.

**А2.** Адзначце акалічнасныя прыслоўі:
1) даўно;
2) тут;
3) асцярожна;
4) чамусьці;
5) звонка.

**А3.** Адзначце прыслоўі, ужытыя ў простай форме вышэйшай ступені параўнання:
1) гарачэй;
2) больш рашуча;
3) меней;
4) менш памылкова;
5) горш.

**А4.** Адзначце прыслоўі, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) навокал;
2) светла;
3) досвіткам;
4) бягом;
5) пазаўчора.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя прыслоўі:
1) патроху;
2) пачалавечы;
3) абы куды;
4) упяцярых;
5) дзе-нідзе.

**Частка В**

**В1.** Утварыце суфіксальным спосабам ад прыметніка *чысты* прыслоўе і запішыце.

□□□□□□□□□□

**В2.** Утварыце прыставачным спосабам ад назоўніка *век* прыслоўе і запішыце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□□□□□□□□□□□

**В3.** Утварыце прыставачна-суфіксальным спосабам ад займенніка *ваш* прыслоўе і запішыце.

□□□□□□□□□□□

**В4.** Утварыце прыставачна-суфіксальным спосабам ад прыметніка *беларускі* прыслоўе і запішыце.

□□□□□□□□□□□

Другі ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх прыслоўі абазначаюць прымету прадмета:

1) прагулка зранку;
2) прыехалі позна;
3) размова па-польску;
4) ціха вымаўляючы;
5) дом насупраць.

**А2.** Адзначце азначальныя прыслоўі:

1) уверсе;
2) радасна;
3) крыху;
4) моўчкі;
5) знарок.

**А3.** Адзначце прыслоўі, ужытыя ў найвышэйшай ступені параўнання:

1) найхаладней;
2) надзвычай паспяхова;
3) больш прынцыпова;
4) мацней за ўсіх;
5) лепей.

**А4.** Адзначце прыслоўі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:

1) утраіх;
2) некуды;
3) злёгку;
4) мімаходам;
5) па-твойму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А5.** Адзначце правільныя напісанні:

1) на-бягу;
2) якраз;
3) на памяць;
4) гэтак сама;
5) раз-пораз.

## Частка В

**В1.** Утварыце ад прыслоўя ***дрэнна*** простую форму найвышэйшай ступені параўнання і запішыце.

□□□□□□□□□□□

**В2.** Устанавіце адпаведнасць паміж ужытымі ў сказах прыслоўямі і разнавіднасцямі акалічнасцей. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Хапала ўдосталь цішыні і спакою. | 1. Акалічнасць часу. |
| Б. У горад мы вярталіся пехатою. | 2. Акалічнасць прычыны. |
| В. Увечары Лявон дапамагаў бацькам. | 3. Акалічнасць меры і ступені. |
| Г. Вакол стаяў густы лес. | 4. Акалічнасць спосабу дзеяння. |
| Д. Спрасонку Віталь не заўважыў перамен. | 5. Акалічнасць месца. |

**В3.** Перакладзіце на беларускую мову прыслоўе ***порознь*** і запішыце.

□□□□□□□□□□□

**В4.** Перакладзіце на беларускую мову спалучэнне ***быстрее всех*** і запішыце.

□□□□□□□□□□□□□

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трэці ўзровень

## Частка А

**А1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх прыслоўі абазначаюць прымету якасці:

1) сустрэўшы ўдзень;
2) вяртанне дахаты;
3) надта хораша;
4) хутка напісаны;
5) вельмі разумны.

**А2.** Адзначце прыслоўі спосабу дзеяння:

1) уголас;
2) пешшу;

3) занадта;
4) шэптам;
5) дарэшты.

**А3.** Адзначце прыслоўі, ад якіх утвараюцца простыя формы ступеней параўнання:
1) ліпка;
2) балюча;
3) добра;
4) слізка;
5) многа.

**А4.** Адзначце прыклады адвербіялізацыі:
1) дзесьці;
2) затым;
3) куды-небудзь;
4) убок;
5) замала.

**А5.** Адзначце правільныя напісанні:
1) надвое;
2) патрое;
3) нагара;
4) у адкрытую;
5) дэ-факта.

**Частка В**

**В1.** Суаднясіце значэнне фразеалагізма ***з жабіны прыгаршчы*** з прыслоўем і запішыце гэта прыслоўе.

□□□□□□□□□□□

**В2.** Суаднясіце значэнне фразеалагізма ***ў свіныя галасы*** з прыслоўем і запішыце гэта прыслоўе ў простай форме вышэйшай ступені параўнання.

□□□□□□□□□□□

**В3.** Устанавіце адпаведнасць паміж ужытымі ў сказах прыслоўямі і іх сінтаксічнай роляй у сказе. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Радасна песня пяецца. | 1. Дзейнік. |
| Б. Гаворка па-ўкраінску ўразіла Антося. | 2. Дапаўненне. |
| В. Зіма была далёка. | 3. Азначэнне. |
| Г. Беларускае “дзе” мілагучнае. | 4. Іменная частка выказніка. |
| Д. Алеся марыла пра шчаслівае заўтра. | 5. Акалічнасць. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□□□□□□□□□□□

**В4.** Устанавіце адпаведнасць паміж ужытымі ў сказах прыслоўямі і часцінамі мовы, значэнні якіх прыслоўі набываюць у сказе. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Вакол дома раслі кветкі. | 1. Злучнік. |
| Б. Іду ў поле, калі туманяцца нізіны. | 2. Прыназоўнік. |
| В. Роўна праз хвіліну пачнецца канцэрт. | 3. Мадальнае слова. |
| Г. У хаце, напэўна, нехта быў. | 4. Безасабова-прэдыкатыўнае слова. |
| | 5. Часціца. |

□□□□□□□□□□□

Таццяна Старасценка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ